***Краязнаўчы каляндар на 2025 год складзены на аснове звестак з энцыклапедычных выданняў і зборнікаў:***

- Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск:БелЭн., 1996-2004;
- Рэспубліка Беларусь: энцыкл : в 6 т. – Мінск: БелЭн., 2005-2008;
- Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн.,1993-2003;
- Культура Беларусі: энцыкл.: у 6 т. – Мінск: БелЭн., 2010-2015;
- Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX стст.: энцыкл. давед. – Мінск: БелЭн., 1995;
- Гродненщина в лицах: [биографический справочник / составители: Ю. И. Косицкий, Л. В. Мальцева, М. А. Комарова ; редколлегия: В. В. Кравцов и др.]. - Минск : Белтаможсервис, 2018. - 245 с.
- Пяткевіч А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / Аляксей Пяткевіч.- Гродна, 2000;
- Культура Гродзеншчыны: Факты. Падзеі. Асобы . – Мінск, 2014;
- Ермоленко Е. А. 400 имён: жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины / В. А. Ермоленко, В. Н. Черепица. – Гродно, 2014;
- Лауреаты премии имени А. И. Дубко "За творческие достижения в области культуры и искусства" / [И. И. Аникевич и др.; составители: Е. В. Климович, Л. Ч. Новицкая; редакционный совет: В. А. Лискович (председатель) и др.]. - Гродно: Гродненская типография, 2018. - 267 с.
- Памяць: Шчучынскі раён. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 590 с.

- Данскіх, С. Стагоддзі і падзеі Шчучынскай зямлі / Сяргей Данскіх . – Баранавічы: Баранов. укруп. тип., 2007. – 252 с.
- Щучинский район: фотоальбом. – Гродно: ГОУПП”Гродненская типография”, 2015. – С.43.

У календары ўказваюцца сувязі дзеячоў з Шчучыншчынай, змешчаны звесткі аб 41 юбілееі прадстаўнікоў розных галін дзейнасці, прадпрыемстваў, арганізацый, ўстаноў.

## У 2025 годзе спаўняецца:



**640** гадоў з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах г.п. **Астрына** Шчучынскага раёна (1385).



**240** гадоў назад у Шчучыне па ініцыятыве Станіслава Баніфацыя Юндзілы закладзены **батанічны сад** (1785).

**135** гадоў з дня нараджэння **Яноўскага Самуіла**, (1890, в. Матылі Шчучынскага р-на — 1935), яўрэйскага журналіста, краязнаўца, бібліёграфа.



**85** гадоў з часу заснавання **Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі (**1940).




**20** гадоў з часу ўрачыстага адкрыцця **памятніка воінам-інтэрнацыяналістам** (2005).

## Студзень



**1 - 75** гадоў з часу заснавання **Васілішкаўскай сельскай бібліятэкі** (1950).

**2 - 70** гадоў з дня нараджэння **Марцінчыка Эдуарда Адамавіча** (нар. у 1955 г., в. Грамкі Шчучынскага раёна), беларускага архітэктара.



**6 – 60** гадоў з дня нараджэння **Козіч Валянціны** (нар. у 1965 г., в. Новы Двор, Шчучынскага раёна), паэтэсы.



**6 – 65** гадоў з дня нараджэння **Васілеўскага Яна Янавіча** (нар. у 1960 г., в. Андрушоўцы, Шчучынскага раёна), (з 2006 па 2022 год - старшыня Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта).



**8 - 75** гадоў з дня нараджэння **Кірвеля Івана Іосіфавіча** (нар. у 1950 г., в. Арцюшы Шчучынскага раёна), беларускага географа, педагога, кандыдата геаграфічных навук , прафесара.



**11 – 75** гадоў з дня нараджэння **Руцкай Алены Вітальеўны** (нар. у 1950 г., в. Дзякаўцы Шчучынскага раёна), паэтэсы, члена СПБ, выдатніка народнай асветы Беларусі, заслужанай настаўніцы Беларусі (1987), аўтара каля 90 навуковых і навукова-метадычных прац.




**15 – 85** гадоў з часу ўтварэння **Шчучынскага раёна** (1940).

## Люты



**2 – 85** гадоў з дня нараджэння **Куца Віктара (Віталія) Канстанцінавіча** (02.02.1940 в. Рыбакі Шчучынскага р-на – 17.05.2023), паэта, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі.



**3 – 50** гадоў з дня нараджэння **Кірвель Ірэны Юзэфаўны** (1975, аг. Васілішкі, Шчучынскага раёна), дацента кафедры грамадзянскага права і працэсу Гродзенскага дзяржаўнага універсітэту імя Янкі Купалы.

**3 – 85** гадоў з дня нараджэння **Логвіна Міхаіла Аляксандравіча** (1940, в. Яселевічы Шчучынскага раёна - 2016), беларускага гаспадарчага і дзяржаўнага дзеяча, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі.



**5 – 90** гадоў з дня нараджэння **Дзікевіча Эдмунда Станіслававіча** (нар. у 1935 г., в. Старая Падражанка Шчучынскага раёна – 29. 01. 2023 г.). З 1980 па 1995 год займаў пасаду загадчыка аддзела адукацыі Шчучынскага раённага выканаўчага камітэта. Заслужаны работнік адукацыі БССР (1991). У 2012 годзе ўдастоены звання Ганаровага грамадзяніна горада Шчучына за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё горада Шчучына і раёна.

**15 – 75** гадоў з дня нараджэння **Вялічкі Магдалены Рыгораўны** (нар. ў 1950 г., в. Даліна Зарэчная Шчучынскага раёна), беларускага вучонага ў галіне біяхіміі і фізіялогіі, доктара медыцынскіх навук, прафесара Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага універсітэта.



**21 – 70** гадоў з дня нараджэння **Нікалаева Мікалая Віктаравіча** (нар. у 1955 г., Шчучын), беларускага гісторыка, грамадскага дзеяча, культуролага, мастацтвазнаўца, доктара

філалагічных навук, аднаго са стваральнікаў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу.

## Сакавік

**5 – 35** гадоў з часу стварэння дзяржаўнай прыродаахоўнай установы **“Рэспубліканскі ландшафтны заказнік “Азёры”** (Гродзенскі і Шчучынскі раёны, 1990).



**9 – 80** гадоў з дня нараджэння **Кірвеля Чэслава Станіслававіча (**нар. у 1945 г., в. Мякішы Шчучынскага раёна**).** Беларускага філосафа, педагога, доктара філасофскіх навук, прафесара, выдатніка адукацыі Беларусі. З 1980 г. працуе ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы.



**27 – 85** гадоў з дня нараджэння **Гайдука Фердынанда Міхайлавіча** (1940, в. Шалькоўшчына Шчучынскага раёна - 2011), беларускага вучонага ў галіне псіхіятрыі, доктара медыцынскіх навук, прафесара, заслужанага работніка аховы здароўя Беларусі, выдатніка аховы здароўя.



**29 – 100** гадоў з дня нараджэння **Кляўзуніка Івана Зіноўевіч** (1925, в. Васілішкі - 2008) — беларускага анестэзіёлага - рэаніматолага,

доктара медыцынскіх навук, прафесара (1970).

## Красавік



**24 – 250** гадоў з дня нараджэння **Фалькоўскага Якава Забядэвуша** (1775 – 1848), асветніка-дабрачынца, аднаго з пачынальнікаў на Беларусі ў навучання глуханямых дзяцей на мове жэстаў. У 1802 – 1815 гг. быў рэктарам піярскай школы ў Шчучыне.

## Май



**15 - 85 гадоў з дня нараджэння Русілка Любові Мікалаеўны,** (нар. у 1940 г., Казахстан), паэтэсы, настаўніцы, увесь працоўны шлях прайшоў у в. Бершты, Шчучынскага раёна.

## Чэрвень

**20 – 75** гадоў з дня нараджэння **Наготкі Івана Васільевіча** (нар. у 1950 г., г.п. Жалудок Шчуынскага раёна), беларускага хірурга, артапеда – траўматолага.

## Ліпень



**13 – 70** гадоў з дня нараджэння **Глаза Аляксандра Уладзіміравіча** (нар. у 1955 г., Шчучын), беларускага вучонага ў галіне ветэрынарыі, члена – карэспандэнта Міжнароднай акадэміі экалогіі, доктара ветэрынарных навук, прафесара. З 1982 г.

працуе ў ГрДАУ.

**21 – 80** гадоў з дня нараджэння **Кічко Станіслава Баляслававіча** (нар. у 1945 г., в. Свірыды Шчучынскага раёна), беларускага мастака (графіка, жывапіс).



**28 – 135** гадоў з дня нараджэння **Крэменя Пінхуса** (1890, г. п. Жалудок Шчучынскага раёна - 1981), мастака, жывапісца, скульптара.

## Жнівень



**15** гадоў з часу заснавання **Стара-Васілішкаўскага клуба-музея** (2010).



**6 – 310** гадоў з дня нараджэння **Догеля Мацея** (1715, в. Гембулы Лідскага павета - 1760), гісторыка-архівіста, педагога, правазнаўца, выдаўца. Вучыўся ў піярскай школе ў Шчучыне.



**31 – 10** гадоў з часу адкрыцця ў Шчучыне **кніжнага магазіна "Белкнига"** (2015).

## Верасень



**5 – 10** гадоў з часу адкрыцця пасля капітальнага рамонту **Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі** (2015).



**6 – 10** гадоў з часу адкрыцця пасля рэстаўрацыі ў былой рэзідэнцыі князёў Друцкіх – Любецкіх **палаца творчасці дзяцей і моладзі** (2015).

**9 - 65** гадоў з дня нараджэння **Дарашкевіча Валерыя Аляксандравіча** (нар. у 1960 г., Шчучын), беларускага вучонага ў галіне сельскай гаспадаркі, правазнаўца, намесніка дырэктара Прававога дэпартамента Еўразійскай эканамічнай камісіі.



**17 – 75** гадоў з дня нараджэння **Карэнда Івана Арсеньевіча,** паэта **(**нар. ў 1950 г., в. Крывічы Іўеўскага раёна). Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Ракавіцкай сярэдняй школы, у Шчучынскім райкаме камсамола, загадчыкам аддзела рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». З 1991 г. на дзяржаўнай і дыпламатычнай службах.

## Кастрычнік



**13 – 95** гадоў з дня нараджэння **Бялко Андрэя Іосіфавіча** (1930, в. Прудцы Шчучынскага раёна - 1997), работніка прамысловай вытворчасці, сталявара МТЗ, Героя Сацыялістычнай Працы (1976). Узнагароджаны двумя ордэнамі Леніна.

**15 – 115** гадоў з часу заснавання **Гродзенскага занальнага інстытута раслінаводства НАН Беларусі** (1910).



**30 – 135** гадоў з дня нараджэння **Урбановіча Міхаіла Іосіфавіча** (1890, г.п. Астрына - 1973), беларускага культурнага дзеяча, педагога, каталіцкага святара.

## Лістапад



**2 – 180** гадоў з дня нараджэння **Іваноўскага Леанарда** (нар. у 1845 г. ў былым фальварку Лябёдка (цяпер у межах аг. Галавічполе - 1919), гаспадарчага і грамадскага дзеяча. Надаваў шмат увагі развіццю і ўдасканаленню гаспадаркі ў

Лябёдцы, імкнуўся ператварыць яе ва ўзорны асяродак агратэхнічнага прагрэсу.



**6 – 60** гадоў з дня нараджэння **Навагродскага Тадэвуша Антонавіча** (нар. у 1965 г. в. Артюшы Шчучынскага раёна), беларускага этнографа, гісторыка.

## Снежань



**20 – 185** гадоў з дня нараджэння **Альхімовіча Казіміра Дамінікавіча** (1840, в. Дэмбрава Шчучынскага раёна - 1916), беларускага жывапісца, графіка, дэкаратара, аўтара жывапісных і пластычных работ для касцёлаў, гістарычных палотнаў і серыі карцін па матывах творчасці А. Міцкевіча.